У. А. Жылко *(г. Гродна)*

# РЭАЛІСТЫЧНАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ РЭЧАІСНАСЦІ Ў РАМАНЕ І. КАНДРАЦЬЕВА «САЛТЫЧИХА»

Рэалізм XIX ст. прынята называць у айчынных сацыягуманітарных навуках крытычным рэалізмам. У гэтым сэнсе тэрмін амаль што поўнасцю адпавядае свайму прызначэнню, паколькі рэалізм і сапраўды паказвае пэўную неадпаведнасць тагачаснага грамадскага ладу нормам чалавечнасці, гуманістычнай маралі, крытычна аналізуючы і асэнсоўваючы ўсю сістэму грамадскіх адносін [1, с.248].

У межах парадыгмы крытычнага рэалізму ў якасці суб’екта вылучаецца постаць выдатнага пісьменніка, паэта, гісторыка і перакладчыка Івана Казіміравіча (Кузьміча) Кандрацьева, які ў шматлікіх творах спрабаваў пераасэнсаваць у мастацкай форме многія гістарычныя падзеі як далёкага мінулага, калі пісьменнік прапанаваў свой погляд на гісторыю старажытнага славянскага племені гунаў і асобу яго правадыра Атылу ў гістарычным рамане «Бич Божий», так і сучаснага яму дня, як у вершах «С натуры», «По диким степям Забайкалья», дзе выразна гучыць матыў выкрыцця сацыяльнай несправядлівасці. Але найбольшую цікавасць з пункту гледжання выяўлення асаблівасцей рэалістычнага адлюстравання рэчаіснасці ўяўляе раман «Салтычиха», у якім, па сутнасці, і раскрываецца эстэтычны ідэал Кандрацьева-рэаліста.

У якасці бадай што асноўнай супярэчнасці ў станаўленні парадыгмы рэалізму выступае супрацьстаянне рамантызму з яго экзальтаванай ідэалізацыяй унутраных перажыванняў асобы, што ў сваю чаргу не надта спрыяла выкрыванню і вырашэнню ўсіх праблемных праяў рэчаіснасці, бо не ўлічвала рэальных законаў грамадскага развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэалізм фарміраваўся на падмурку рамантызму і ўвабраў у сябе шмат прыёмаў, характэрных для творчасці ў межах рамантычнай культурнай парадыгмы. Як вядома, вялікім дасягненнем рамантыкаў было майстэрства псіхалагічнага выкрыцця і аналізу, што садзейнічала спасціжэнню чалавечай асобы, пазнанню ўнутранага свету чалавека. Суб'екты мастацкай творчасці ў межах крытычнага рэалізму пераняли ў рамантыкаў адзін з найважнейшых эстэтычных прынцыпаў – прынцып гістарызму: гісторыя чалавецтва і гісторыя мастацтва з усімі яго асобнымі відамі разглядаюцца як непарыўны, як адзіны працэс, у якім звязаны між сабой усе этапы і кожны з этапаў мае сваю непаўторную спецыфіку [1, с. 251].

Так, у аснову рамана І. Кандрацьева пакладзены рэальныя падзеі, якія адбываліся, што засведчана дакументальна, у XVIII – пачатку XIX ст. і былі звязаны з лёсам гістарычна верагоднай асобы, памешчыцы Дар'і Мікалаеўны Салтыковай. Аўтар мэтанакіравана падае даты разгортвання апісаных у рамане падзей, дзякуючы чаму раман чытаецца як гістарычная хроніка таго часу. Менавіта праз аўтарскае апісанне жыццёвага шляху дадзенай асобы падаецца магчымым выявіць адметнасці рэалістычнага адлюстравання рэчаіснасці ў рамане.

Лінія Салтычыхі праводзіцца ў рамане праз зварот да недалёкага мінулага, рэтраспектыўны аповед пра дзяцінства і сталенне галоўнай гераіні – гэта рабілася найперш з мэтай больш уважліва прасачыць станаўленне гэтай асобы і выявіць прычыны яе далейшых паводзін. Нягледзячы на тое, што адной з вызначальных рэалістычных дамінант выступае падкрэсленая ўзаемаабумоўленасць характару і ўчынкаў чалавека сацыяльнымі абставінамі, у якія ён трапляе ад нараджэння, у выпадку з Дар'яй Салтыковай гэта не з'яўляецца дамінуючым фактарам, паколькі дзяўчынка нарадзілася ў прыстойнай сярэдняй па тым часе сям'і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былога сяржанта імператарскага палка, якая прытрымлівалася стрыманага, размеранага ладу жыцця ў невялікім малінавым доміку, дзе кожны наступны дзень нагадваў папярэдні.

Раман здзіўляе сваёй горкай пранікнёнасцю ў псіхалогію галоўнай гераіні: становіцца зразумелым, што яе буйны, нястрыманы характар, які пачынае праяўляцца ўжо ў дзяцінстве праз стасункі з бацькамі і настаўнікам, не з’яўляецца абумоўленым сацыяльным становішчам бацькоў і тымі ўмовамі, у якіх дзяўчынка гадавалася. Яе шалёная неўтаймаванасць, якая нярэдка мяжуе з жорсткасцю і агрэсіяй нават у дачыненні да самых блізкіх людзей, мае хутчэй больш глыбінную прыроду – прыроджанай гіпертрафаванай злосці, якая праз дробязі вылівалася на ўсіх незалежна ад сацыяльнага статусу чалавека (дастаткова прыгадаць памешчыка Цютчава, які таксама быў з дваран).

Варта адзначыць у дачыненні да рэалістычнай вымалёўкі вобраза Салтычыхі, які ў тагачаснай гісторыі меў акрэслена негатыўную ацэнку, што аўтар тым не менш не ставіць яе жорсткасць цалкам ёй у віну, а хутчэй акрэслівае як велізарную бяду жанчыны: І. Кандрацьеў адмаўляецца ад падрабязнага апісання крывавых салтычысіных распраў над прыгоннымі, а больш ухіл робіць на падкрэсленае перабольшванне чутак, якія разносілі самі сяляне (прынамсі, Сідорка) пра жорсткія свавольствы памешчыцы, – тым самым пісьменнік хоча звярнуць увагу на тое, што па тым часе такое «бацькоўскае» пакаранне памешчыцай сваіх прыгонных лічылася дзесьці нормай, хоць і супярэчыла чалавечай маралі.
А публічнае выкрыццё і агалошванне перад грамадскасцю ўчынкаў Дар’і Салтыковай сведчыла пра хуткія змены ў сацыяльных адносінах з прыгоннымі, лёс якіх змяніла адмена прыгоннага права ў 1861 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўтар звяртаецца да ўзнаўлення на старонках рамана і многіх гістарычна значных падзей таго часу – кшталту вянчання Пятра II, смерці Ганны Іаанаўны ці каранацыі імператрыцы Кацярыны II, – на іх фоне, часта паралельна з імі, пісьменнік падае аповед пра падзеі не такога вялікага дзяржаўнага размаху, але ў некаторай ступені таксама лёсавызначальныя, паколькі неўзабаве і яны патрапяць у гісторыю праз выключнасць асобы Салтычыхі: шлюб бацькоў Дар'і, нараджэнне і сталенне неўтаймаванай Чортавай Сяржанткі і г.д.

Асноўную ўстаноўку пісьменнікі-рэалісты бачылі ў тым, каб не капіраваць рэчаіснасць, а выражаць яе. Мастак, на думку А. дэ Бальзака, не проста летапісец сваёй эпохі, а яе даследчык, вучоны-аналітык, палітык і паэт. Спецыфіка і сіла рэалізму ў тым, каб пераадольваць суб'ектывізм у імя праўды. Як слушна зазначыў В. Каратынскі, мастацтва павінна быць праўдай, павінна змагацца за справу вечна жывой праўды, бо ў адваротным выпадку, як з'ява без мэты ці з часовай мэтай, яна зробіцца абыякавай для грамадства [2, с.43].

Для паўнаты ўспрымаемай карціны тагачаснага жыцця І. Кандрацьеў у сваім рамане прыбягае не толькі да апісання адносін у сацыяльных іерархічных колах, дзе статус і заможнае сваяцтва вырашалі ўсё, нават ратавалі ад суда і пакарання, але і да дэталізацыі паўсядзённага жыцця з усімі яго традыцыямі і звычаямі. Размовы персанажаў рамана падаюцца нібыта пачутыя ў памешчыцкай сядзібе, на двары або ў леснічоўцы. У рамане сапраўды шмат рэалістычных фрагментаў, якія тычацца, напрыклад, апісання традыцый кулачных боек. Увогуле, спрадвеку кулачная бойка была самай звычайнай і самай любімай забавай на Русі. У творы праўдзіва адноўлены малюнак удалога спаборніцтва, у якім мужчыны, падобна да былінных волатаў, мераліся сваёй сіла і маладзецтвам:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*В то время любители боев обыкновенно собирались в партии: летом на широких перекрестках, а то и просто на обширных дворах домов, зимой – непременно на льду, и таким образом создавались две враждебные стороны. < …>Всякому мужчине со здоровым телом и здоровым кулаком хотелось быть богатырем своей земли…*[3, с.74].

Гэтыя праўдзівыя апісанні і сітуацыі заклікаены дакладна аднавіць кантэкст праяў характару галоўнай гераіні, памешчыцы Салтыковай, якая, будучы маладой яшчэ дзяўчынай, вырашыла паўдзельнічаць у кулачнай бойцы, чым і прывабіла свайго будучага мужа Глеба Аляксеевіча.

*Под влиянием такого молодечества среди мужчин, нередко молодечествовали и женщины, невзирая на свое затворничество.<…> Есть указания, что девицы в борьбе частенько побеждали добрых молодцев* [3, с.76–77].

Рэалістычны раман не пазбаўлены і рыс рамантызму, да якіх звяртаецца аўтар падчас апісання вобразаў простых сялян: Галіны, Міканора, Сідоркі. Рысы рамантызму выяўляюцца ў першую чаргу ў паказе еднасці простага селяніна з прыродай, з наваколлем: дастаткова прыгадаць палясоўшчыка Міканора, бацьку Галіны, якому спакойна жылося на ўлонні прыроды ў беднай леснічоўцы. Любіла пабыць сам-насам з прыродай і маці Галіны, якая ў хвіліны заклапочанасці сыходзіла з хаты разам з немаўляткам у глыб лесу на палянку, дзе размаўляла з дрэвамі ды спявала свае цыганскія песні. Такія шчыльныя стасункі з прыродай спрыялі станаўленню духоўнай чуллівасці, што вяло за сабой абвостранае пачуццё справядлівасці ды імкненне да духоўнай волі. Менавіта таму не змог стрываць здзеку з дачкі Міканор, наклаўшы на сябе рукі. Асноўнымі аксіялагічнымі складнікамі рэалізму другой паловы XIX ст. выступаюць такія рысы народнага характару, як працавітасць, абвостранае пачуццё справядлівасці, пачуццё ўласнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

годнасці, спагадлівасць, руплівасць, – яны ўласцівы прадстаўніку простага народа, селяніну, за правы якога фактычна і змагаліся рэалісты-творцы, выкрываючы і асуджаючы сродкамі сваёй мастацкай спадчыны яскравыя моманты сацыяльнай несправядлівасці.

Паказваючы істотнае, а то і поўнае здрабненне асобы ў грамадстве з існуючым прыгонным правам у рамане І. Кандрацьеў адлюстраваў разам з тым і супраціўленне разбэшчанаму ўздзеянню гэтага грамадства на чалавека, увасобіў высокія маральныя каштоўнасці, імкненне да сацыяльнай справядлівасці. Не трывае несправядлівасці Галіна, якая рашае адпомсціць Салтычысе за тое, што яна разбурыла яе сям'ю і знішчыла каханне. Тым не менш дзяўчына не здольная ўзяць грэх на душу і забіць чалавека, хай сабе і ненавіснага ёй, нават калі такая магчымасць выпадае, мы памятаем, што Галіна адступае. У сваю чаргу, Салтычыха без разваг забівае Сідорку, які пагражаў сарваць аперацыю помсты за здраду Цютчаву. У гэтым бачыцца выразнае проціпастаўленне простага прыгоннага чалавека і бяздушнай памешчыцы. Аднак нельга сказаць, што аўтар цалкам ідэалізуе селяніна, які змушаны цярпець здзекі памешчыцы праз свой прыгон. Сярод дваровых былі і прыстасаванцы, якія не толькі цярпліва пераносілі здзекі, але і славілі сваю барыню, фактычна былі вернымі яе рабамі (Акім, кухар Кучудук, вартаўнік Ануфрый).

У сваім рамане І. Кандрацьеў, безумоўна, імкнецца да ўзнаўлення жыццёвай праўды, «жыцця ў формах самога жыцця» і ў межах гэтага – адлюстравання «тыповых характараў у тыповых абставінах». Паводле аўтарскай канцэпцыі, у сапраўднай рэчаіснасці жыццё чалавека вызначаецца не толькі яго здольнасцямі, але і грамадскімі ўмовамі, пэўным чынам залежыць ад іх: памешчыцкая ўседазволенасць, абумоўленая наяўнасцю прыгоннага права, дала магчымасць для рэалізацыі Салтычыхай сваёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыроднай жорсткасці і агрэсіі, якая неўзабаве прывяла да шматлікіх ахвяр і паламаных лёсаў. Такім чынам, мастацтва рэалізму паказвае ўзаемадзеянне чалавека з асяроддзем, уздзеянне грамадскіх умоў на лёсы людзей, на іх духоўны свет і норавы.

Адпаведнасць мастацкіх вобразаў і сітуацый, апісаных у рамане, жыццёвай рэальнасці не азначае простага праўдападабенства і механічнага капіравання. У мастацтве рэалізму мастацкі вобраз выяўляе адзінства знешняга і ўнутранага, рэальна ўспрымальнага і сутнаснага, недасяжнага павярхоўнаму ўспрыманню. Так, у вобразе Салтычыхі І. Кандрацьеў не проста выкрывае жорсткі характар і агрэсіўны нораў, месцамі аўтар нават спачувае сваёй гераіні, паколькі яна праз сваю невыноснасць была неверагодна самотная, бо ніколі нікога не любіла па-сапраўднаму, яе душу сілкавалі здзекі, а не ўзнёслыя пачуцці. Салтычыха сама вырашыла, што не ў кім не мае патрэбы, нават ва ўласных дзецях. За канкрэтнай жыццёва верагоднай з’явай ці чалавечым лёсам, што ўвасоблены ў рамане, паўстае рэальнасць самога жыцця. Шматграннасць чалавечага быцця раскрываецца ў мастацкім творы праз сутыкненне характараў Ганны і Салтычыхі, праз выяўленне складанай гамы пачуццяў абедзвюх гераінь, іх душэўных драм – усяго таго, што складае жыццё чалавечага духу.

У рамане выразна гучыць матыў расплаты чалавека за свае ўчынкі, што таксама ўласціва рэалістычнай мадэлі светаадчування. Злосць Салтычыхі даведзена да крайнасці, тое гора ды пакуты, якія яна чыніла навакольным людзям праз неўтаймаванасць свайго характару, урэшце рэшт абярнуліся супраць яе самой і прывялі да трагічнага завяршэння. Абвінавачаная ў «катаванні і душагубстве», пазбаўленая дваранскага тытулу, усімі забытая і пагарджаная, так і памерла яна ў астрозе, адбываючы пажыццёвае пакаранне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, эстэтычны ідэал Кандрацьева-рэаліста арыентуе нас на праблемы грамадства і сцвярджае як найважнейшую каштоўнасць сацыяльную справядлівасць, асуджаючы жорсткасць і ўседазволенасць прыгону ў адносінах да чалавека. У сваім рамане праз рэалістычнае адлюстраванне рэчаіснасці XVIII – пачатку XIX ст. ён паказвае не толькі залежнасць чалавека ад грамадскіх умоў, але і ставіць пытанне пра патрэбу змянення грамадскага ладу на аснове ідэалаў дабра і справядлівасці.

______________

1. *Гуляев, Н.А.* Литературные направления и методы в русской и зарубежной литературе XVII–XIX веков / Н.А. Гуляев. – М. : Высш. школа, 1983. – 359 с.

2. *Каратынскі, В.* Творы / В. Каратынскі. – Мінск : Мастац. літ., 1994. – 406 с.

3. *Кондратьев, И.* Салтычиха / И. Кондратьев. – М. : Мир книги, 2011. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ